*Психические особенности.* 1) Инфантилизация массового сознания ведёт к тому, что становится легче внедрять идеи и образы. 2) Ориентация массового сознания на развлечения, что ведёт к возникновению такого явления как инфотейнмент [9, 137].

**Заключение.** Глобализация как феномен оказывает влияние на все сферы жизни общества, в частности на процесс коммуникации. Таким образом, глобализация как фактор международных отношений и порождаемые ею особенности должны учитываться в процессе формирования международного имиджа политических субъектов.


Список литературы

1. Добреньков, В.И. Вызовы глобализации и перспективы человечества / В.И. Добреньков // Вестник Московского университета. Серия 18. Социология и политология. – 2004. – № 4. – С. 3-20.
2. Ланцов, С.А. Мировая политика и международные отношения: Учебное пособие / С.А. Ланцов [и др.]. Под ред. С.А. Ланцова, В.А. Ачкасова. – СПб.: Питер, 2006. – 448 с.
3. Ровинская Т. Интернационализация и глобализация средств массовой информации / Т. Ровинская // Мировая экономика и международные отношения. – 2007. – № 6. – С. 80-93.
4. Вартанова, Е.Л. Глобализация СМИ и масс-медиа России / Е.Л. Вартанова // Вестник Московского университета. Серия 10. Журналистика. – 2005. – № 4. – С. 9-24.
5. Эффект CNN // TOP 30 / Словарь. Терминология военного времени [Электронный ресурс.] – 2014. – 6 февраля. – Режим доступа: http://военныйсловарь.рф/post/Effekt-CNN.aspx – Дата доступа: 04.01.2016.
6. Агеносов, А.В. Политическая имиджелогия / А.В. Агеносов [и др.]; под ред. А.А. Деркача, Е.Б. Перелыгиной и др. – М.: Аспект Пресс, 2006. – 400 с.
7. Гаджиев, К.С. Имидж как инструмент культурной гегемонии / К.С. Гаджиев // Мировая экономика и международные отношения. – 2007. – № 12. – С. 3-14.
8. Василенко, И.А. Образ России в виртуальном диалоге культур / И.А. Василенко // Вестник Московского университета. Серия 12. Политические науки. – 2008. – № 3. – С. 3-20.
9. Лиллекер, Д. Политическая коммуникация. Ключевые концепты / Д. Лиллекер. – Харьков: «Гуманитарный центр», 2010. – 300 с.


## ПАРАФІЯ СВ. БАРБАРЫ Ў ВІЦЕБСКУ І ЯЕ ДУШПАСТЫРЫ ПАСЛЯ 1917 ГОДА


*К.В. Лаўрыненка*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*


Апошнім часам узрастае цікавасць да вывучэння лакальнай гісторыі.

Мэта артыкула – разгледзець гісторыю касцёла святой Барбары ў Віцебску пасля 1917 года.

**Матэрыял і метады**. Пры напісанні артыкула былі выкарыстаны дакументы Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці, а таксама працы беларускіх даследчыкаў, якія працуюць у галіне вывучэння Каталіцкага Касцёла. Былі выкарыстаны агульнанавуковыя і спецыяльна-гістарычныя метады.

**Вынікі і іх абмеркаванне**. Сённяшні касцёл святой Барбары ў Віцебску быў пабудаваны ў 1883 г. ксяндзом Георгіям Мотузам і кансэкраваны ў гонар св. Барбары і св. Юзафа 4 снежня 1884 г. біскупам Францыскам А. Сымонам.

У 1917 годзе, пасля якога пачаліся вялікія выпрабаванні для святыні, яе душпастыраў і вернікаў, парафія налічала 4150 чалавек, а яе пробашчам быў ксёндз тут Ігнат Рудзіс (1870–1895), а вікарыем ксёндз Стэфан Здзіхоўскі [1].

У 1922–1923 гг. пробашчам парафіі св. Барбары і дэканам у Віцебску быў ксёндз Пётр Бараноўскі (21.3.1882 – 1908 – 3.11.1937, ГУЛАГ) [2].

У 1922 г. у Віцебску быў арыштаваны ксёндз Стэфан Трускоўскі (2.9.1896 – 1921 – 1.3.1959), калі падчас кампаніі па канфіскацыі царкоўных каштоўнасцяў адмовіўся аддаваць каштоўнасці з касцёла св. Барбары і св. Антонія [3]. Ён быў асуджаны да 5 гадоў пазбаўлення волі і вывезены ў Бутырскую турму Масквы. Затым быў вызвалены праз абмен палітвязнямі паміж Польшчай і СССР і 28 красавіка 1924 г. выехаў з СССР.

Затым у касцёле служыў ксёндз Уладыслаў Хшчановіч (1884–1907), які ў 1924 г. пад націскам агентаў ГПУ, прылюдна адрокся ад веры, што выклікала згаршэнне у вернікаў. На ратаванне сітуацыі ў касцёл св. Барбары духоўнымі ўладамі быў спешна высланы Слуга Божы ксёндз Баляслаў Слосканс (19.08.1893 – 21.01.1917 – май 1926 – 18.04.1981) [4]. Аднак у пачатку 1925 г. святар быў адкліканы назад у Петраград. 4 снежня 1926 г. ужо біскуп Слосканс і Апостальскі Адміністратар Магілёўскі і Мінскі адслужыў у касцёле св. Барбары сваю першую пантыфікальную Імшу.

Наступным пробашчам касцёла св. Барбары і, верагодна, паралельна касцёла св. Антонія Падуанскага быў прызначаны 6 ліпеня 1925 г. ксёндз Пётр Аўгло пасля вызвалення з арышту (праходзіў па справе арцыбіскупа Яна Цепляка і 14 петраградскіх святароў). Аднак у 1927 г. святар быў паўторна арыштаваны [5].



Репозиторий ВГУ

Наступны ксёндз – Юзаф Вярыга (1866 ці 1867 – 1891 – пасля 1933) , служыў тут на пачатку 1930-х верагодна як адміністратар і касцёла св. Антонія, і св. Барбары ў Віцебску. Святар быў арыштаваны 28 лютага 1933 г. у Віцебску і асуджаны 5 мая 1933 г. асобай нарадай пры АДПУ за "антысавецкую агітацыю і як арганізатар антысавецкай арганізацыі" да 3 гадоў высылкі ў Казахстан, дзе і загінуў на чужыне [6].

У кастрычніку 1933 г. пасля вяртання з адбыцця пакарання і ссылкі, ксёндз Язэп Барадзюля быў прызначаны пробашчам двух касцёлаў – св. Барбары і св. Антонія. Аднак пасля дзясяці дзён працы, 14 кастрычніка, святар атрымаў ад ГПУ загад паўторнай ссылкі ў Архангельск [7].

У першай палове 1930-х ў касцёле св. Барбары служыў ксёндз Станіслаў Райко.

Касцёл св. Барбары быў зачынены пасля 1935 г, верагодна, у 1937 г.

У 1939 г. ўлады вырашылі разбурыць касцёл, ды спачатку аддалі яго на рабаванне марадзёрам – так была знішчана ўся касцельная маёмасць. Канчатковаму знішчэнню святыні, відаць, перашкодзіла вайна, але будынак і агароджа падчас ваенных дзеянняў былі часткова разбураны. У часы ваеннага ліхалецця касцёл св. Барбары быў нячынны.

У 1950-ыя гг. на месцы каталіцкіх могілак побач з касцёлам была размешчана аўтабаза. Пасля таго, як быў узарваны касцёл св. Антонія, у Віцебску застаўся толькі касцёл св. Барбары, хаця і нячынны. Некаторы час ён выкарыстоўваўся як склад штучных угнаенняў.

Вернікі, аднак, змагаліся за свой касцёл. У кастрычніку 1956 г. дзве жанчыны-каталічкі з г. Віцебска звярнуліся да упаўнаважанага ў справах рэлігійных культаў па пытанні рамонту і адкрыцця касцёла ў горадзе (хутчэй за ўсё гутарка шла пра касцёл св. Барбары). Зразумела, што савецкім органам улады абсалютна быў непатрэбны дзейны касцёл у г.Віцебску, таму ўпаўнаважаны верніцам адмовіў, а сам напісаў у справаздачы: "Пасля праведзенай з імі размовы яны зразумелі, што адрамантаваць касцёл вернікі не здолеюць" [8].

Таксама нешматлікія віцебскія вернікі збіраліся на малітвы без святара. Калі была магчымасць, прымалі сакрамэнты ў касцёлах Літвы і Латвіі. Пасля 1971 г. некалькі разоў да віцебскіх вернікаў з душпастырскай паслугай прыязджаў ксёндз Юзаф Пятушка MIC. У 1978 г. зноў дзве віцебскія верніцы збіралі подпісы за адкрыццё касцёла.

Наступныя падзеі, калі напрыканцы 1980-ых пачала змяняцца атмасфера ў грамадстве, выратавалі касцёл ад канчатковага разбурэння. У 1987 г. гарвыканкам даручыў аддзелу культуры праектаванне рэстаўрацыі касцёла, каб адчыніць тут арганную залу. У 1988 г. касцёл святой Барбары быў унесены ў спіс помнікаў гісторыі і культуры рэспубліканскага значэння і, такім чынам, узяты пад ахову дзяржавы.

У пачатку 1990 г. жыхарка Віцебска Станіслава Семеракова і іншыя вернікі дамагаліся адкрыцця зачыненай уладамі святыні. (Маюцца звесткі, што гэта менавіта спадарыня Семеракова збірала подпісі ў жыхароў Віцебска аб адкрыцця касцёла яшчэ напрыканцы 1970-ых гг.). У тым жа годзе ў Віцебск прыехаў дамініканін а. Януш Скэнчэк OP. Першапачаткова святую Імшу ён цэлебраваў у прыватным доме, пасля – у капліцы Святога Крыжа каля касцёла, якую ў 1988 г. пачалі адбудоўваць капліцу. Яна мела столькі ж гадоў, колькі і першы касцёл, аднак пасля была ўшчэнт зруйнаваная.

Нягледзячы на тое, што ўжо ў 1990 г. віцебскія вернікі прасілі дзяржаву зарэгістраваць іх парафію, чакаць ім, аднак, прыйшлося яшчэ два гады. 7 лютага 1992 г. парафія Святой Барбары, нарэшце, была афіцыйна зарэгістраваная органамі ўлады і касцёл быў перададзены вернікам. Праўда, на працягу яшчэ некалькіх гадоў у касцёле адбываліся канцэрты арганнай музыкі, аднак віцебскія вернікі ўжо мелі свой дом малітвы. 5 чэрвеня 1993 г. кардынал Казімір Свёнтэк паўторна асвяціў адбудаваную святыню.

З утварэннем у 1999 г. Віцебскай дыяцэзіі касцёл святой Барбары стаў катэдральным, а 20 лістапада тут быў высвечаны першы Віцебскі біскуп – ксёндз Уладзіслаў Блін. Пазней у Віцебску былі ўтвораны іншыя парафіі, а ў 2011 г. віцебскай катэдрай стаў касцёл Езуса Міласэрнага.

7 верасня 2013 г. шматлікія вернікі і святары з Віцебска і ваколіц сабраліся на ўрачыстую святую Імшу ў касцёле святой Барбары, каб адзначыць 20-годдзе рэкансэкрацыі святыні. Гамілію падчас Імшы прамовіў а. Міхал Ермашкевіч OP, пробашч парафіі святой Барбары з 2000 г. і па 2012 г. Ён узгадаў, як, будучы студэнтам мастацка-графічнага факультэта мясцовага педінстытута, упершыню прыйшоў у гэтую святыню. Апынуўшыся ў касцёле, ён убачыў непрыглядную карціну: усюды стаялі рыштаванні, у скляпеннях віднеліся дзіркі і ўсё было вельмі забруджана. Пры гэтым захаваліся знакі кансэкрацыі святыні – крыжыкі ў вяночку з галінак алівы.

Рэпазіторый ВДУ

Летам 1998 г. айцец Міхал Ермашкевіч ОР адслужыў у касцёле святой Барбары прыміцыйную святую Імшу. Ад пачатку адраджэння дзейнасці парафіі сваю паслугу тут нясуць айцы дамініканцы.

**Заключэнне.** Такім чынам, нягледзячы на цяжкія выпрабаванні, якія выпалі на долю касцёла і святароў, што служылі ў ім, пасля 1917 года, на пачатку 1990-ых гадоў дзейнасць парафіі была адноўлена.


Спіс літаратуры

1. Directorium Divini Officii et Missarum pro Archidioecesi Mohiloviensi nec non pro dioecesi minscensi in annum Domini 1917. – S. 162.
2. Маракоў Л. І. Рэпрэсаваныя каталіцкія духоўныя, кансэкраваныя і свецкія асобы Беларусі (1917 – 1964) // Леанід Маракоў: Смэлтак. – Мінск, 2009. - С. 45
3. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. Ф. 123 воп. 1, справа 771, лл. 131,158, 161, 166, 172.
4. Л. Гарошка.Старонкі з крыжовае дарогі Каталіцкае Царквы на Беларусі (фрагмент) // Гарбінскі Ю. Беларускія рэлігійныя дзеячы XX стагоддзя. Нав.- рэд. савет: У. Конан (адказны рэд.) і інш. – Мн. –Мюн.: "Беларускі кнігазбор", 1999. - С. 373.
5. Маракоў Л. І. Рэпрэсаваныя каталіцкія духоўныя, кансэкраваныя і свецкія асобы Беларусі (1917 – 1964) // Леанід Маракоў.: Смэлтак. – Мінск, 2009. - С. 26.
6. Тамсама, с. 104.
7. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. Ф. 4029, воп. 1, справа 16, л. 36.
8. Тамсама, ф. 4029, воп. 2, спр. 6, л. 21.


## ИССЛЕДОВАНИЕ ИНТЕРНЕТ-РЕКЛАМЫ СУБЪЕКТОВ ТУРБИЗНЕСА Г. ВИТЕБСКА


*Л.А. Леонова*
*Витебск, ВГУ имени П.М. Машерова*


Тема является актуальной, так как современный потребитель туристского продукта внимательно изучает информацию, прежде всего в сети Интернет (вследствие ее доступности для любого сегмента), предлагаемую субъектами туристического бизнеса, анализирует ее и принимает положительное или отрицательное решение о покупке. Современные условия монополистической конкуренции, в которых функционируют туристические агентства и операторы, показывают важность сети Интернет в привлечении, завоевании и удержании потребителя. Детально продуманная стратегия информирования потребителей должна обеспечить соответствующий уровень их заинтересованности и продаж туристских продуктов. Целью работы стало изучение особенностей и возможностей сети Интернет в сфере рекламы туристских продуктов на примере субъектов турбизнеса г. Витебска.

**Материал и методы.** В работе использованы данные Национального статистического комитета Республики Беларусь, общедоступные информационные ресурсы турфирм г. Витебска; научная информация сети Интернет. В процессе исследования были использованы методы: описательный для исследования направлений использования сети Интернет как инструмента рекламы в сфере туризма; сравнительный для изучения интернет - рекламы туристского продукта фирм г.Витебска; аналитический для изучения механизмов продвижения туристских продуктов турагентства «Велл» посредством сети Интернет в среде потенциальных и реальных потребителей.

**Результаты и их обсуждение.** Реклама в сети Интернет в первую очередь предполагает создание и продвижение вебсайта туристической фирмы. Сайт должен решать следующие задачи: давать информацию о предлагаемых туристических продуктах; заинтересовывать потенциальных потребителей; предоставлять соответствующие сервисы, позволяющие приобрести туристические продукты фирм. По данным Министерства спорта и туризма Республики Беларусь, в нашей стране зарегистрировано более 1250 турфирм[4]. Можно отметить, что не все турфирмы создают свой веб-сайт, состоящий из одной или нескольких веб-страниц с гипертекстовым, текстовым, медийным и другими типами содержания. Так, в г.Витебске из 70 субъектов, имеющих лицензию на осуществление туристической деятельности, свой веб-сайт имеют 43 турфирмы, что составляет около 62 процентов от общего количества. В то же время просматривается тенденция постепенного увеличения числа турфирм Республики Беларусь, имеющих веб-сайт. Так, около трети веб-сайтов были созданы в течение последних лет. Однако наличие собственного сайта, не всегда говорит о высоком конкурентном уровне интернет – рекламы фирмы. Как пример можно рассмотреть веб-сайт туристического агентства «Геваль»[5]. Главная страница веб-сайта компании имеет невзрачный дизайн серо-голубой цветовой палитры. Слоган сайта: «Мы всегда думаем о Вас!» не имеет новизны и может привести к ироничному восприятию в аудитории потенциальных потребителей. Почти весь контент веб-сайта составляет текстовая информация. Можно сделать вывод, что не использован практиче-

Репозиторий ВГУ